This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2023.pp.77-99

Przegląd Środkowo-Wschodni, 8, 2023
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20230804

Data przesłania: 01.03.2023
Data akceptacji: 18.04.2023

**Дзмітрый Віцько**
Беларускі гістарычны агляд
zmiejavik@gmail.com
https://orcid.org/0009-0009-1072-9659

# Перамовы Сапегаў з пасламі рэспубліканцаў у Варшаве летам 1698 г.

**Rokowania między Sapiehami a posłami republikanów w Warszawie latem 1698 r.**

Artykuł poświęcony mało dotąd znanej próbie pokojowego zakończenia wielkiego konfliktu, który przeszedł do historii jako wojna domowa w Wielkim Księstwie Litewskim (1696–1702). Przyczyny konfliktu dotychczas nie zostały w pełni zbadane. Najlepiej, zdaniem autora, ujawniły się w czasie rokowań między zwaśnionymi stronami. Materiały omawianych rokowań dają możliwość prześledzenia wzajemnych pretensji, natomiast wychodząc z tego, jak się zmieniały stawiane warunki, możemy wywnioskować, w jakim stopniu stronnictwa w rzeczywistości dążyły do zawarcia trwałej ugody. Rozbieżności dotyczyły przede wszystkim liczebności i opłacania wojska, nadużyć skarbowych i niektórych innych kwestii. Rokowania trwały 30 czerwca – 22 lipca 1698 r. pod auspicjami króla Augusta II i części senatorów Rzeczypospolitej, zaś ich efektem stało się zawarcie ugody między Sapiehami a posłami republikańców, którzy działali bez niezbędnych uprawnień, licząc na przyszłe potwierdzenie umowy. W tych warunkach umowa nie rozstrzygnęła wszystkich kwestii spornych, częściowo nawet pogłębiła je, zwiększając liczbę wojska oraz wynagrodzenia hetmanom. Czołówka republikańców, pozostająca w Wielkim Księstwie, odrzuciła ją i zaczęła przygotowania do pospolitego ruszenia. W ten sposób zamiast załagodzenia konfliktu doprowadziło to do jego zaognienia.

Słowa kluczowe: rokowania, stronnictwo, republikanie, wojsko

У гісторыі грамадзянскай вайны 1696–1702 г. у Вялікім Княстве Літоўскім перыяды працяглых баявых дзеянняў змяняліся спробамі перамоў паміж бакамі, якія пакуль даследаваны недастаткова[1]. Між тым, вывучэнне гэтых спроб можа праліць святло на сутнасць канфлікту ў не меншай, а то і большай ступені, чым падрабязнае апісанне сілавога супрацьстаяння, паколькі на перамовах закранаёліся ўсе спрэчныя пытанні, якія былі прычынай нязгоды і канфлікту. Супрацьстаянне паміж групоўкамі Сапегаў і рэспубліканцаў было выклікана, па версіі апошніх, парушэннем усеўладнымі магнатамі шляхецкіх праў і свабод. Аднак гэта былі агульныя абвінавачанні, тады як канкрэтныя рознагалоссі застаюцца ў цяні і патрабуюць высвятлення.

Пачатак 1698 г. прайшоў пад знакам абвастрэння ўнутрыпалітычных адносін у Княстве. 22 лютага ў Шкудах у Жамойці была ўтворана скіраваная супраць Сапегаў канфедэрацыя часткі войска ВКЛ. Таксама ў красавіку гэтага года адбыўся з’езд шляхты ВКЛ у Вільні, прымеркаваны рэспубліканцамі да адкрыцця Галоўнага Трыбунала. На з’ездзе правадыр рэспубліканцаў віцебскі кашталян Міхал Казімір Коцел быў зацверджаны генеральным палкоўнікам ваяводстваў і паветаў ВКЛ, а вялікі харужы ВКЛ Грыгорый Антоній Агінскі – генеральным рэгіментарам. Першаму з іх прызнавалася права склікання паспалітага рушэння, другому – фактычна функцыі галоўнакамандуючага замест гетмана[2].

Пасля Віленскага з’езда да караля былі накіраваныя паслы: падстолі ВКЛ Лявон Казімір Агінскі, як пасол з гэтага з’езда, разам

[1] Пра адну з такіх спробаў гл.: Д. Віцько, *Рэспубліканска-сапежынскія перамовы на з’ездзе ў Горадні восенню 1701 г.*, „Беларускі гістарычны агляд”, т. 18, сш. 1–2, 2011, с. 61–97.

[2] A. Rachuba, *Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763*, Warszawa 2002, s. 319; G. Sliesoriūnas, *Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės Vyriausiasis Tribunolas Vilniuje XVII ir XVIII amžių sandūroje – politinės kovos arena*, „XVIII amžiaus studijos”, t. 2, Vilnius 2015, p. 260–264; Д. Віцько, *Галоўны Трыбунал ВКЛ 1698 г.: судовая расправа над Сапегамі*, „Arche”, 2016, № 3, с. 102–108.

з берасцейскім падкаморым Людвікам Канстанцыем Пацеем, як паслом ад Трыбунала. Яны павінны былі прасіць манарха скласці конны сойм, на якім рэспубліканцы хацелі суда над Сапегамі, а да таго часу перадаць усё войска пад камандаванне Грыгорыя Антонія Агінскага[3].

Пацей і Агінскі выехалі ў Варшаву ў траўні, калі ўжо становішча рэспубліканцаў у ВКЛ пахіснулася – пасля таго, як у ноч на 30 красавіка большая частка іх войска без бою капітулявала пад Жыжмарамі[4]. Вялікі гетман паведаміў пра гэта каралю, папрасіўшы, каб суняў „новазавербаваныя купы некаторых ваяводстваў і паветаў, якія яшчэ засталіся", і намякнуўшы, што без гэтага цяжка будзе забяспечыць заробкам і гібернай войска, якое ўжо гатова да вайсковай кампаніі супраць турак[5]. Таксама 8 траўня ён выдаў універсалы да ваяводстваў і паветаў ВКЛ, у якіх паведаміў пра поспех („а калі так будзе і далей – то каб былі ласкавыя дапамагчы, падаткаў ніякіх не складалі на іх пажытак, але хутчэй каб грошы рыхтавалі і звозілі на камісію, прызначаную войску, якое ўваходзіць у рэестр і ўжо ідзе на вайну")[6].

У сярэдзіне траўня Аўгуст II накіраваў у Вільню з лістамі як пасрэдніка менскага старасту Крыштафа Завішу, які павінен быў запрасіць у Варшаву на перамовы з Сапегамі лідараў рэспубліканцаў: віцебскага кашталяна Коцела, вялікага харужага Агінскага, абодвух

[3] A. Rachuba, *Wielkie Księstwo Litewskie...*, s. 319; Д. Віцько, *Галоўны Трыбунал ВКЛ...*, с. 107–108.

[4] Падрабязней пра гэта гл.: Д. Віцько, *Галоўны Трыбунал ВКЛ...*, с. 108–118.

[5] Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD), Archiwum Radziwiłłow (AR), dz. II, ks. 32, k. 115–116, К.Я. Сапега да Аўгуста II, Горадна, 3 траўня 1698 г., копія.

[6] Ibidem, Zbiór Branickich z Suchej (ZBS), sygn. 41/55, s. 102v–104, універсал К.Я. Сапегі да ваяводстваў і паветаў ВКЛ, Горадна, 8 траўня 1698 г.; Ibidem, AR, dz. II, ks. 32, k. 116–119, тое самае да Берасцейскага павета; Vilniaus universiteto biblioteka. Rankraščių skyrius (VUB RS), f. 7, sign. 32/13909, l. 46–47, тое самае да Вількамірскага павета, б. д., актыкаваны ў павятовых гродскіх кнігах 22 траўня 1698 г.; гл. таксама: Biblioteka Książąt Czartoryskich w Krakowie (BCz), rkps. 192, nr 33, k. 186–189, ліст К.Я. Сапегі да Віленскага павета, Горадна, 10 траўня 1698 г.; Ibidem, rkps. 521, k. 203–205, тое самае.

Пацеяў (Людвіка Канстанцыя і яго брата, троцкага харужага Казіміра Аляксандра) ды мсціслаўскага харужага Марцыяна Дамініка Валовіча. Таксама забараніў ім склікаць паспалітае рушэнне, бо гэта была яго, каралеўская, прэрагатыва[7]. Аднак у гэты ж самы час здарылася падзея, якая значна ўскладніла магчымае пагадненне. Па дарозе ў Варшаву, на Падляшшы, на рэспубліканскіх паслоў Агінскага і Пацея напалі жаўнеры, высланыя наўздагон Сапегамі, у ходзе чаго Агінскі быў цяжка паранены, а Пацей абрабаваны[8]. 22 ці 24 траўня апошні з іх быў прыняты Аўгустам II, але змог толькі коратка паскардзіцца на гэту атаку, бо атрыманую пасламі інструкцыю ў іх забралі пры нападзе[9].

27–30 траўня адбылася рада сената, у якой ад ВКЛ бралі ўдзел троцкі ваявода Казімір Уладзіслаў Сапега, жамойцкі кашталян Яўстахій Вільгельм Гротуз і вялікі падскарбі Бенядзікт Павел Сапега. У першы дзень быў таксама падканцлер ВКЛ Караль Станіслаў Радзівіл, які зачытваў прапановы ад караля (галоўнымі пытаннямі былі знешнепалітычныя). Напрыканцы дададзена было

[7] K. Zawisza, *Pamiętniki (1666–1721)*, wyd. J. Bartoszewicz, Warszawa 1862, s. 58; Archiwum Państwowe w Toruniu (APT), kat. II, dz. XIII, sygn. 34, s. 252–252v, каралеўскі мемарыял К. Завішы, травень [1698 г.], копія; BCz, rkps. 192, nr 34, k. 191–195, Аўгуст II да М.К. Коцела, Варшава, 15 траўня 1698 г.; Ibidem, rkps. 521, k. 205–207, тое самае; A.Ch. Załuski, *Epistolarum historico-familiarium*, t. II, Brunsbergae 1711, p. 561–562, тое самае (лацінскі пераклад), 13 траўня – відаць, памылкова.

[8] Гл. пра гэты эпізод: Д. Віцько, *Падстолі ВКЛ Лявон Казімір Агінскі і яго роля ў міжусобных канфліктах канца XVII ст.*, „Герольд Litherland", № 22, Горадня–Менск 2021, с. 35–37.

[9] AGAD, AR, dz. II, ks. 27, k. 103, прамова Л.К. Пацея перад каралём у Варшаве 22 траўня 1698 г.; тое самае: Ibidem, ks. 32, k. 130–131; BCz, rkps. 521, k. 259–261; AGAD, ZBS, sygn. 41/55, s. 108v–109, 24 траўня 1698 г.; Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA), f. 1135, ap. 2, b. 65, l. 85–85v, тое самае; BCz, rkps. 3436, k. 77v–78, памылкова дата – 8 траўня 1698 г. і імя пасла; Львівська національна наукова бібліотека України ім. В. Стефаника. Відділ рукописів (ЛННБУ. Відд. рук.), ф. 5, оп. 1, спр. 1447, арк. 228, памылкова дата – 2 траўня 1698 г.; Lietuvos mokslų akademijos Vrublievskių biblioteka. Rankraščių skyrius (LMAVB RS), f. 148, b. 62, l. 48–48v, б. д.

яшчэ ў вуснай форме пытанне замірэння ў ВКЛ (не ўключанае ў пісьмовую павестку „з-за інтрыг некаторых іх міласцяў”, але каго канкрэтна – невядома). Яго закранулі ў сваіх выступленнях усе сенатары, якія падтрымалі намаганні ў гэтым кірунку. Супраць рэспубліканцаў выразна выказаліся плоцкі біскуп Анджэй Хрызастом Залускі, які выступаў у першы дзень (абвінавацію іх, што ні каралеўскіх універсалаў не слухаюць, ні камісараў не прымаюць), і каронны вялікі падскарбі Геранім Аўгусцін Любамірскі, які выступаў 30 траўня (казаў пра сваволле праціўнікаў вялікага гетмана Казіміра Яна Сапегі). Вялікі падскарбі ВКЛ, які выступаў за ім, акрамя „крыўд свайго дому і сваіх прыяцеляў”, скардзіўся, што ў скарбу забралі мыта і іншыя паступленні. У заключэнне кароль паабяцаў узяць на сябе замірэнне ВКЛ[10].

[10] BCz, rkps. 192, nr 47, k. 228–233, 233–249, прапановы, рашэнні і дыярыуш рады сената, Варшава, 27–30 траўня 1698 г. (два варыянты: кароткі, са спісам прысутных, і падрабязны – з прамовамі ўсіх удзельнікаў); Biblioteka PAU i PAN w Krakowie (BPAU-PAN), rkps. 977, k. 71. Гл. таксама каралеўскі ўніверсал, якім забаранялася адбіраць у скарбу мыта і тытунёвую манаполію: LVIA, Senieji aktai (SA), b. 43, l. 367–368, універсал Аўгуста II да шляхты Віленскага павета і да мытных адміністратараў і службоўцаў, Варшава, б. д. дзённай, 1698 г., атрыманы ў віленскім гродскім судзе 18 траўня, упісаны ў кнігі Галоўнага Трыбунала ВКЛ 21 траўня 1698 г.; VUB RS. F. 7, sign. 32/13909, l. 45, тое самае да Вількамірскага павета. Пазней кароль выдаў універсал, якім абвяшчаў, што бярэ ў сваю пратэкцыю скарбнага ВКЛ Яна Шрэтара, якога спрабавалі пазбавіць паўнамоцтваў адміністратара мытні на той падставе, што ён асуджаны Галоўным Трыбуналам ВКЛ: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), КМФ-18, воп. 1, спр. 149, арк. 212, універсал Аўгуста II да шляхты ВКЛ, 20 ліпеня 1698 г.

Размова, відавочна, ішла пра прэтэнзіі ломжынскага лоўчага Фартуната Замойскага і віленскага райцы Яна Яхімовіча, саступленыя ашмянскаму падстолію Міхалу Багуславу Коцелу, які і судзіўся са Шрэтарам. Сутнасць іх была ў тым, што скарбны ВКЛ нібыта падкупіў Уладзіслава Рора, які загадваў скарбовай канцылярыяй, каб той выдаваў ад імя падскарбія загады, якія парушалі ўмовы кантракту з Замойскім і Яхімовічам (маўляў, Шрэтар, „быўшы перад тым адміністратарам гэтага ж мыта ВКЛ і нажыўшы з яго сабе вялікага багацця”, не хацеў, каб яго арандаваў нехта іншы). Справа разглядалася ў Галоўным Трыбунале ВКЛ у 1698–1700 гг. У 1700 г. да Міхала Багуслава ў якасці істца дадаўся Міхал Казімір Коцел. 16 жніўня 1700 г. Трыбунал вынес рашэнне: Шрэтар павінен быў

Між тым, Завіша як каралеўскі пасланнік прыбыў 23 траўня ў Вільню і сустрэўся там з лідарамі рэспубліканцаў („пачалі мы адразу ж умовы міру абмяркоўваць”, – як запісаў у сваім дзённіку)[11]. Аўгуст II запрашаў іх на перамовы ў Варшаву 18 чэрвеня. Аднак прыбылі на гэты час (дакладней, назаўтра) толькі Сапегі і хто-ніхто з іх прыхільнікаў (вялікі гетман Казімір Ян, канюшы Міхал Францішак, вялікі стражнік Міхал Юзаф Сапегі і полацкі ваявода Дамінік Міхал Слушка), таму яны былі адкладзены яшчэ на восем дзён[12]. Па некаторых дадзеных, рэспубліканцы хацелі, каб Аўгуст II выдаў універсалы на соймікі, на якіх абралі б дэлегатаў на перамовы, а як пасярэдніка – прыслаць да іх вялікапольскага генеральнага старасту Рафала Ляшчынскага[13].

Калі і на другі тэрмін ад рэспубліканцаў ніхто не з’явіўся, Аўгуст II схіліў да перамоў Агінскага і Пацея. Перамовы пачаліся 30 чэрвеня. Вяліся яны пры пасрэдніцтве караля і прысутных

прысягнуць, што не ўступаў у змову з Рорам і не чыніў перашкод Замойскаму і Яхімовічу. 18 жніўня ён гэтую прысягу выканаў і быў вызвалены ад адказнасці, а галоўным адказчыкам у справе імавернага парушэння кантракту быў прызнаны падскарбі, і Коцелы, калі жадалі, маглі судзіцца з ім. Пасля Алькенікаў яны дабіліся завочнага асуджэння Сапегі і прысуджэння сабе па гэтай справе 335 тыс. злотых, гл.: LVIA, SA, b. 385, l. 1462–1463v; Ibidem, b. 386, l. 2326–2353v; Ibidem, b. 388, l. 75–82v, дэкрэты Галоўнага Трыбунала ВКЛ ад 5 верасня 1699 г., 18 жніўня і 14 снежня 1700 г. У тым жа 1698 г. да атакі на Шрэтара падключыўся і інстыгатар ВКЛ Станіслаў Рукевіч, які абвінаваціў яго, што „жыдоў на мытні хавае [...], ад якіх такія скандалы дзеюцца, што хаваючы ў сябе распяцце для прысягі хрысціян, гэтыя ж жыды надзвычайна яго зневажаюць і насміхаюцца”: Ibidem, b. 214, l. 41–41v, пратэстацыя С. Рукевіча на Я. Шрэтара ў Галоўным Трыбунале ВКЛ, 2 траўня 1698 г.

[11] K. Zawisza, *Pamiętniki...*, s. 58.

[12] *Awizy warszawskie różne y lwowskie*, z Krakowa, 5 Iulij 1698, [k. 2], навіны ад 19 [чэрвеня] 1698 г.; AGAD, AR, dz. V, sygn. 15655, s. 58–59, С.А. Шчука да К.С. Радзівіла, 19 чэрвеня 1698 г.; Ibidem, sygn. 11913/I, s. 9–10, Л.К. Пацей да К.С. Радзівіла, Варшава, 20 чэрвеня 1698 г.; параўн.: [J.B.] Parthenay, *Dzieje panowania Fryderyka Augusta II, króla polskiego*, Warszawa 1854, s. 120.

[13] AGAD, AR, dz. V, sygn. 13939/IV, s. 12, К. Сарнэцкі да К.С. Радзівіла, Варшава, 16 чэрвеня 1698 г.

сенатараў. Спачатку дамовіліся, што паслам рэспубліканцаў будуць вернуты палітычныя дакументы, захопленыя ў іх пры нападзе[14]. Сапегі засядалі ў мальбаркскага ваяводы Яна Ежы Пшэбяндоўскага, рэспубліканцы – у кароннага рэферэндара Станіслава Антонія Шчукі; самі перамовы праходзілі ў каралеўскім замку[15].

Прапановы, высунутыя рэспубліканцамі, былі разбітыя на некалькі блокаў. Першы датычыў т. зв. каэквацыі – ураўнавання праў літоўскай і польскай шляхты. Адпаведная пастанова была прынятая элекцыйным соймам 1697 г., і рэспубліканцы дамагаліся яе выканання. Апелюючы да польскіх норм, патрабавалі таксама, каб гетманы не прэтэндавалі на месца маршалка Галоўнага Трыбунала, не ўмешваліся ў яго выбары, не былі прысутнымі на іх і не прысутнічалі нават у Вільні падчас паседжанняў (за выключэннем выпадкаў працэсуальнай неабходнасці, напрыклад, прысягі, калі яны маглі прыязджаць з абмежаваным суправаджэннем). Патрабавалася таксама, каб на сойміках не з’яўляліся жаўнеры, якія не маюць жыхарства ў павеце, а хто б іх туды насылаў – каб быў пазбаўлены гонару і права ў іх удзелу.

Другая частка тычылася прызнання і захавання „рэпартыцыі”, прынятай на Віленскім з’ездзе ў красавіку гэтага года (г. зн. сістэмы выплаты заробку войску ВКЛ, якая прадугледжвала замацаванне канкрэтных харугваў за пэўнымі паветамі). Пры гэтым татараў прапаноўвалася выключыць з рэестра войска, а колькасць рэйтараў скараціць да 400 ставак, паколькі яны даліся ў знакі шляхце сваімі рабункамі (на той момант іх было 600 ставак, але рэспубліканцы падазравалі, што гетман трымае харугвы і звыш вызначанай колькасці. – *Д. В.*). Нанесеныя страты прапаноўвалася Сапегам пакрыць з уласнай кішэні. Месца распушчаных татарскіх і рэйтарскіх харугваў павінны былі заняць новыя шляхецкія. Прапаноўвалася, каб

[14] Ibidem, sygn. 11913/I, s. 9–14, Л.К. Пацей да К.С. Радзівіла, Варшава, 20 і 26 чэрвеня, 2 ліпеня 1698 г.

[15] APT, kat. II, dz. XIII, sygn. 34, s. 259, A. Хайнацкі да Д. Янітцэна, Варшава, 8 ліпеня 1698 г.

на новыя харугвы кароль выдаў прыпаведныя лісты і каб зараз жа быў падрыхтаваны новы рэестр.

Войска мусіла заставацца на тых кватэрах, што былі вызначаны ў пастанове аб каэквацыі, пакуль сойм не прызначыць новыя. У сувязі з тым, што эканоміі былі спустошаныя, у чым вінавацілі татараў і рэйтараў, завербаваных звыш дазволенай колькасці, якія займалі месцы іншых харугваў, то Сапегам прапаноўвалася пакрыць і гэтыя страты, нанесеныя каралеўскім уладанням (праз кампенсацыю іх трымальнікам).

Ставілася пытанне адказнасці падскарбія за дэфіцыт у скарбе: прыходную частку бюджэта, пачынаючы з 1684 г., рэспубліканцы ацэньвалі ў 45 млн злотых, з якіх „на войска не было выдадзена і паловы”. Тое самае датычыла і загадвання каралеўскімі эканоміямі падчас бескаралеўя, прыбыткі з якіх нібыта цалкам былі прыўлашчаны, і цяпер ад падскарбія патрабавалі кампенсацыі. Таксама ад яго вымагалі вярнуць прысвоенае ўзнагароджанне вайсковымураднікам ВКЛ у памеры 100 тыс. злотых у год, якое „ніколі ім не выплочвалася”. Гэта ж датычыла гіберны („у невядомай колькасці”), якая не выдавалася на „польскія” харугвы (цяжкую конніцу). Яшчэ адно патрабаванне датычыла забароны перадаваць Сапегам праз кантракты каралеўскія эканоміі. Таксама ад гетмана патрабавалі кампенсацыі за размяшчэнне войска ў прыватных уладаннях. Сюды ж дадавалася патрабаванне кампенсацыі за захоп уладанняў і прыўлашчванне з іх прыбыткаў (без удакладнення, пра якія маёнткі ідзе размова). Таксама Агінскі і Пацей патрабавалі кампенсацыі за нядаўні на іх напад ды пакарання ў выглядзе інфаміі для тых, хто правярае пошту і парушае таямніцу прыватнай перапіскі, у чым таксама абвінавачвалі Сапегаў. Акрамя таго, падымалася пытанне расстрэлу па загаду гетмана незадоўга перад гэтым рэспубліканцаў Багуслава Бакея і Караля Белазора ды, адпаведна, пакарання за гэта ці кампенсацыі.

Далей ішлі асобныя пажаданні. Сапегам прапаноўвалася адмовіцца ад канкурэнцыі ў барацьбе за ўрады канцлера і вялікага мар-

шалка, паколькі *pacta conventa* забаранялі наданне міністэрскіх урадаў прадстаўнікам аднаго дому. Патрабавалася таксама прызнанне трактата ад 3 сакавіка гэтага года паміж рэспубліканскай шляхтай і часткай войска ВКЛ, у адпаведнасці з якім была скасаваная большасць даўгоў па заробку гэтаму войску. Што тычыцца рэшты харугваў, пакідалася права адлічыць з іх заробку страты, нанесеныя шляхецкім уладанням. Ад вялікага гетмана патрабавалі не размяшчаць войскі ў гэтых уладаннях. Нарэшце, перамоўшчыкі дамагаліся гарантый бяспекі для іх саміх, а таксама для Грыгорыя Антонія Агінскага (абранага незадоўга да гэтага жамойцкім старастам), харужых троцкага Казіміра Аляксандра Пацея, жамойцкага Казіміра Заранка, мсціслаўскага Марцыяна Дамініка Валовіча, жамойцкага стольніка Якуба Казіміра Гружэўскага і некаторых іншых[16].

Прапановы захаваліся, запісаныя ў два слупкі. У першым змешчаны зыходныя патрабаванні, прыведзеныя вышэй. „Другі праект”, у правым слупку, змяшчае аргументы ў дапаўненне да іх, з элементамі палемікі. Аргументы прыводзіліся ад імя шляхты ВКЛ („шляхецкага стану”), што можа ўказваць на нейкія кансультацыі з лідарамі рэспубліканцаў, якія засталіся ў ВКЛ. У прыватнасці, ёсць звесткі, што рэспубліканцы прысылалі ў гэты час паслоў са сваімі прапановамі, жадаючы іх уключэння ў праект[17].

Так, наконт рэпартыцыі Сапегі пярэчылі, што яна была прынятая без удзелу гетманаў (на што рэспубліканцы парыравалі, што гэта не абмяркоўваецца, бо рэпартыцыя прадугледжана каэквацыяй, якую самі ж Сапегі пагаджаюцца выконваць, і наогул – іх прэрагатывам гэта не шкодзіць). Наконт рэйтараў і татараў Сапегі звярталі ўвагу,

---

[16] AGAD, AR, dz. II, ks. 35, k. 728–731, „Пункты трактата”, б. д., копія, [ліпень 1698 г.]; Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu (BOss), rkps. 260/II, k. 689–695, тое самае.

[17] [J.B.] Parthenay, *Dzieje panowania...* s. 120 („Літоўская шляхта прыслала са свайго боку прадстаўнікоў да караля са скаргамі на Сапегаў і некалькімі артыкуламі, жадаючы іх уключэння ў запланаваную дамову. Гэтыя артыкулы былі прынятыя і ўжытыя ў пэўнай ступені ў якасці асновы для заключанай дамовы”).

што гэтыя адзінкі неабходныя для кампаніі супраць Турцыі ў гэтым годзе (рэспубліканцы парыравалі, што „ваяводствы з гэтага часу даюць замест гэтых распушчаных на папаўненне [войска] свае шляхецкія харугвы”). Сапегі таксама прапаноўвалі ў выпадку, калі войска не атрымае заробку, вярнуцца да „ранейшай практыкі” (момант не да канца ясны: відаць, размова пра збор падаткаў да каэквацыі ці спагнанне даўгоў. – *Д.В.*). Іх апаненты пагаджаліся, што гэта было б справядліва, але „не ў бягучых абставінах”, бо Сапегі маглі б самі тады да гэтага імкнуцца, каб атрымаць нагоду вяртання да старых парадкаў. Адзінае, у чым рэспубліканцы змякчалі пазіцыю, гэта скарбовыя злоўжыванні Бенядзікта Паўла Сапегі. Тут ад імя „шляхецкага стану” выказвалася гатоўнасць перадаць гэта на разгляд караля і прыняць любое яго рашэнне. Нарэшце, абвяшчалася, што шляхта не рассядлае коней, пакуль не ўбачыць выканання ўсіх сваіх патрабаванняў[18]. Акрамя таго, высоўваліся і немалыя фінансавыя прэтэнзіі: вялікі гетман ацэньваў страты ад канфедэрацыі 1696 г. на чале Агінскім у 7 млн злотых, рэспубліканцы ацэньвалі свае прэтэнзіі ў 4 млн злотых. Па некаторых дадзеных, у ходзе перамоў яны патрабавалі ад Сапегаў таксама складання паўнамоцтваў[19].

12 ліпеня быў складзены першы чарнавы варыянт дамовы. Ён налічваў дзевяць пунктаў: 1) Прызнанне ўсімі бакамі каэквацыі; 2) Гетманы і падскарбі выдаюць асігнацыі харугвам паводле рэпартыцыі; 3) Кватэры войску пакуль прызначаюцца паводле пастановы аб каэквацыі, але часова, потым соймам будуць вызначаны іншыя; там жа войска мелася атрымаць заробак за дзве чвэрці гэтага года паводле рэестра, верыфікаванага гетманамі і польным пісарам непасрэдна на кампаніі, „у полі”. Калі гэтыя грошы не будуць прывезеныя на кватэры, то гетман мог вярнуцца, зноў жа, да „ранейшай практыкі”. Для выплаты заробку склікалася камісія на падставе

[18] AGAD, AR, dz. II, ks. 35, k. 728–731, „Пункты трактата”, б. д., копія, [ліпень 1698 г.]; BOss, rkps. 260/II, k. 689–695, тое самае.

[19] AGAD, Archiwum Tyzenhauzów, C-12, s. 173, К. Кандратовіч да А. Глэмбоцкага, Варшава, 18 ліпеня 1698 г.

пастановы каранацыйнага сойма, дзеля чаго кароль мусіў выдаць універсалы, якімі прызначыць на 12 лістапада соймікі (відавочна, для абрання дэпутатаў) і вызначыць дэпутатаў з сената[20]; 4) За адмову ад часткі паўнамоцтваў прызначалася гадавое ўзнагароджанне вялікаму гетману ў 100 тыс. злотых, польнаму – 70 тыс. і падскарбію – 100 тыс. злотых. Скарб мог па-ранейшаму „трымаць" збор некаторых падаткаў, перададзеных пастановай аб каэквацыі на павятовы ўзровень (тытунёвай манаполіі, жыдоўскага пагалоўнага); 5) Пытанне выключэння з рэестра татараў, каб не змяншаць войска перад кампаніяй, адкладалася да фармавання новага рэестра на наступны сойм (дадзены пункт быў затым выкраслены і заменены на рашэнне адкласці гэта на камісію, дададзенае ў п. 3 і разгорнутае шырэй у наступнай рэдакцыі. – *Д.В.*); 6) Усе крыўды ўзаемна даваліся, а пытанне „рэальных" страт адкладалася да наступнага сойма, які бакі абяцалі не зрываць. Шкода, нанесеная Агінскаму і Пацею, мусіла быць кампенсаваная, а ўсё забранае вернута. Забаранялася насылаць жаўнераў на соймікі; 7) Трыбунал не павінен быў судзіць пад аховай войска, а гетманы не мусілі прэтэндаваць на месца маршалка (за выключэннем выпадкаў, калі б на гэта была ўсеагульная згода); 8) Бакі абяцалі не складаць соймікаў і з'ездаў з мэтай нашкодзіць адно аднаму, не прымаць і не выконваць адпаведных пастаноў і судовых рашэнняў, спыніць ужо распачатыя працэсы; паспалітае рушэнне, дзе яно збіралася ці планавалася, мусіла быць распушчана – Аўгуст II абяцаў выдаць універсалы з адпаведным заклікам; 9) Гарантам прызначаўся кароль, які меўся дапамагчы ў выпадку чаго пацярпеламу пры парушэнні дамовы[21].

---

[20] Тут можна адзначыць, што пастанова каранацыйнага сойма прадугледжвала камісію для падзелу абяцаных каралём на элекцыі грошай на пакрыццё даўгоў перад войскам. У гэтым жа выпадку размова ішла яўна пра вайсковую камісію для выплаты яму заробку з падаткаў. Хаця канстытуцыя аб каэквацыі прадугледжвала, што такая камісія будзе прызначана каранацыйным соймам, але гэтага зроблена не было. – *Д.В.*

[21] AGAD, Archiwum Publiczne Potockich, sygn. 134, s. 419–423, праект мірнага пагаднення ў ВКЛ, Варшава, 12 ліпеня 1698 г., чарнавы варыянт.

У той жа дзень гэты праект быў перапісаны, скарочаны і набыў наступны выгляд. Два першыя пункты захоўваліся, але ў другі пункт было перанесена рашэнне наконт кватэр і дададзена вайсковая камісія ў Горадне ды парадак яе склікання. Камісія мусіла пачаць працу праз два тыдні пасля Св. Марціна (г. зн. пасля 11 лістапада), а скончыць праз чатыры пасля яго. На гэтай жа камісіі павятовыя камісары павінны былі прыняць рашэнне наконт татараў (спачатку пытанне павінны былі разгледзець соймікі і даць ім адпаведныя інструкцыі), пакуль жа татарскія харугвы мусілі прыняць удзел у кампаніі. Было дададзена таксама (відаць, пры пазітыўным вырашэнні гэтага пытання) захаванне рэестра ў 9 тыс. ставак да наступнага сойма (што, аднак, было на 440 ставак больш, чым да гэтага, г. зн. рэальна ён павялічваўся. – *Д.В.*). Трэці пункт прадугледжваў выплату двух чвэрцяў заробку паводле падпісанага ў полі рэестра. Калі б з нейкіх паветаў не былі своечасова прывезены падаткі, тады на той жа камісіі было б прызначана прымусовае іх спагнанне. Чацвёрты пункт датычыў узнагароджання гетманам і падскарбію; затым ішлі астатнія ўмовы, якія паўтараліся з невялікімі дапаўненнямі: дазвол скарбу займацца зборам некаторых падаткаў, забарона прыводзіць з сабой на соймікі жаўнераў (акрамя звычайнага суправаджэння для гетманаў), забарона размяшчаць жаўнераў у прыватных уладаннях, узаемнае дараванне (акрамя рэальных страт), абяцанне не зрываць наступны сойм, кампенсацыя і зварот рэчаў паслам, роспуск паспалітага рушэння і забарона склікання новых з’ездаў, гарантыі караля[22].

Каб схіліць бакі да пагаднення, 14 ліпеня кароль раздаў прадстаўнікам розных груповак вакантныя пасады: вялікаму харужаму Грыгорыю Антонію Агінскаму быў нададзены ўрад жамойцкага

[22] Ibidem, s. 417–418, 425, праект мірнага пагаднення ў ВКЛ, Варшава, 12 ліпеня 1698 г. Шэраг пытанняў быў выкраслены: „Аб рэестры, каб яго прэзентаваць перад ваяводствамі, падпісаны рукой гетмана”; „Аб роспуску татараў і рэйтараў”, „Каб ваяводствы і паветы не раней расслядлалі коней, чым войска выйдзе ў поле”. Гэтыя патрабаванні рэспубліканцаў былі адхілены.

старасты, урад харужага, які вызваліўся пасля яго – Юзафу Чартарыйскаму, вялікага маршалка – надворнаму маршалку Аляксандру Паўлу Сапегу, надворнага маршалка пасля яго – вялікаму пісару Казіміру Міхалу Пацу[23]. Акрамя таго, урад канцлера быў паабяцаны падканцлеру Каралю Станіславу Радзівілу, а падканцлера – менскаму старасце Крыштафу Завішы[24]. За ўрад польнага пісара працягвалася барацьба паміж берасцейскім падкаморым Людвікам Канстанцыем Пацеем і вялікім стражнікам Міхалам Юзафам Сапегам[25]. Намінацыю Сапегі на вялікага маршалка рэспубліканцы яшчэ пэўны час аспрэчвалі (*pacta conventa* забаранялі наданне міністэрскіх урадаў прадстаўнікам аднаго дому), у сувязі з чым не мог заняць свой урад і Пац[26]. Акрамя гэтага, 18 ліпеня ўрад генерала артылерыі атрымаў канюшы ВКЛ Міхал Францішак Сапега[27].

Вынікам перамоваў стала мірнае пагадненне, заключанае 22 ліпеня 1698 г. на наступных умовах:

---

[23] *Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku*, oprac. H. Lulewicz i A. Rachuba, Kórnik 1994, s. 29, 74, 78.

[24] AGAD, Archiwum Tyzenhauzów, C-12, s. 174, К. Кандратовіч да А. Глэмбоцкага, Варшава, 18 ліпеня 1698 г. Акрамя таго, паводле Кандратовіча, урад мсціслаўскага ваяводы быў паабяцаны віцебскаму кашталяну Коцелу, а наваградскага кашталяна – гарадзенскаму маршалку Стафану Яўстахію Александровічу. Што тычыцца Александровіча, то ён ужо быў наваградскім кашталянам з 20 красавіка гэтага года. Адносна перспектыў Коцела можна хіба што дапусціць, што мелася на ўвазе нейкае павышэнне мсціслаўскага ваяводы Міхала Казіміра Сесіцкага, калі тут няма памылкі, бо той толькі нядаўна (19 красавіка) атрымаў гэты ўрад. З іншага боку, магчыма, гэта былі нейкія няпэўныя намінацыі, гл.: *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego (UWKL)*, t. II: *Województwo trockie. XIV–XVIII wiek*, pod red. A. Rachuby; oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, P.P. Romaniuk, A. Haratym; przy współpracy A. Macuka i J. Aniszczanki, Warszawa 2009, s. 269; *UWKL*, t. IX: *Województwo mścisławskie, XVI–XVIII wiek*, pod red. A. Rachuby; oprac. H. Lulewicz, T. Jaszczołt, A. Radaman, A. Rachuba, P.P. Romaniuk, A. Macuk, A. Danilczyk, A. Haratym, Warszawa 2019, s. 195.

[25] AGAD, Archiwum Tyzenhauzów, C-12, s. 174, К. Кандратовіч да А. Глэмбоцкага, Варшава, 18 ліпеня 1698 г.; параўн.: A.Ch. Załuski, *Epistolarum...*, t. II, p. 592.

[26] *Urzędnicy centralni...*, s. 74, 78.

[27] Ibidem, s. 38 (ранейшы генерал артылерыі Матэвуш Ромер ад яго адмовіўся).

1) Бакі пацвярджалі, што прызнаюць каэквацыю.

2) Права выдачы асігнацый да бліжэйшага сойма прызнавалася гетману (пры наглядзе падскарбія).

Прадугледжвалася, што з падаткаў, збор якіх на моцы каэквацыі быў ужо перададзены на павятовы ўзровень, прынамсі два (тытунёвая манаполія і яўрэйскае пагалоўнае) скарб па-ранейшаму зможа збіраць, калі „ваяводствы” дадуць на гэта згоду.

Была прызначана камісія для разлікаў з войскам у Берасці, якая павінна была пачаць працу за два тыдні перад 11 лістапада (днём Святога Марціна) і скончыць праз два тыдні пасля яго. Шляхта павінна была абраць на яе па аднаму камісару ад павета на сойміках, якія Аўгуст II абавязаўся скласці 25 жніўня. У склад камісіі кароль прызначаў таксама сенатараў; туды ж уваходзілі гетманы і іншыя адказныя ураднікі.

Да сойма захоўваўся рэестр войска ў 9 тыс. ставак. Пытанне ўваходжання ў яго татараў адкладалася на рашэнне павятовых камісараў, пакуль жа татары меліся ўзяць удзел у кампаніі.

Прадугледжвалася таксама скліканне іншай камісіі, прызначанай рашэннем каранацыйнага сойма (г. зн. для падзелу абяцаных каралём грошай на войска).

3) Размяшчэнне харугваў на зімовыя кватэры адбывалася паводле канстытуцыі аб каэквацыі, у вызначаных ёй месцах, але займаўся гэтым вялікі гетман. Затым сойм мусіў прызначыць іншыя кватэры.

Войска пасля вяртання з кампаніі мусіла атрымаць заробак за дзве чвэрці гэтага года паводле рэестра, верыфікаванага на кампаніі польным пісарам разам з гетманамі. Калі б яно гэтых грошай не атрымала, тады па рашэнні камісіі мусіла быць прызначана прымусовае іх спагнанне ў адпаведных паветах. Калі б грошай не прывезлі ўсе паветы, тады „гетманскі ўрад” мог вярнуцца да „ранейшай практыкі”, пакуль сойм не прыйме іншага рашэння.

4) За адмову ад часткі паўнамоцтваў прызначалася ўзнагароджанне для гетманаў і падскарбія: вялікаму гетману – 100 тыс. злотых у год, польнаму – 70 тыс., вялікаму падскарбію – 100 тыс. злотых.

5) Усе крыўды ўзаемна дараваліся, а пытанне нанесеных у ходзе супрацьстаяння страт адкладалася на будучы сойм. Абодва бакі абавязаліся, што не будуць яго зрываць з гэтай нагоды.

Забаранялася прыводзіць на соймікі жаўнераў (за выключэннем звычайнага суправаджэння гетманаў) і размяшчаць войскі ў шляхецкіх уладаннях. У той жа час пацвярджалася ранейшая юрысдыкцыя гетманскага суда.

6) Паспалітае рушэнне альбо выправы мусілі быць распушчаныя. Рэспубліканцы мусілі адмовіцца ад складання соймікаў і з'ездаў, скіраваных супраць Сапегаў, а таксама ад выканання скіраваных супраць іх судовых рашэнняў.

7) Гарантам пагаднення прызнаваўся кароль, які павінен быў дапамагчы ў выпадку яго парушэння пацярпеламу боку.

Хаця двое паслоў падпісалі гэту дамову як прадстаўнікі рэспубліканцаў, Агінскі адзначыў, што падпісваецца пры ўмове наступнага яе зацвярджэння[28].

[28] BCz, rkps. 192, nr 50, k. 301–304, пагадненне Сапегаў з пасламі рэспубліканцаў, Варшава, 22 ліпеня 1698 г., актыкаванае у гарадзенскім гродскім судзе 30 ліпеня 1698 г., копія ад 14 кастрычніка 1784 г.; AGAD, Archiwum Zamojskich (AZ), sygn. 3055, k. 55–56, 65–69, тое самае, выпіс з гарадзенскіх гродскіх кніг у дзень актыкацыі; LVIA, f. 1135, ap. 2, b. 27, l. 310–312, тое самае, копія выпісу (не ўсе пасрэднікі ўказаны як пасрэднікі, толькі першы); іншыя копіі: AGAD, AR, dz. II, ks. 35, s. 822–826 (памылкі ў подпісах); BCz, rkps. 192, nr 47, k. 262–266 (без даты дзённай); LVIA, f. 1135, ap. 2, b. 27, l. 314v–316 (подпісы няпоўныя); AGAD, ZBS, sygn. 46/60, k. 389–389 (без подпісаў); НГАБ, ф. 694, воп. 12, спр. 261, арк. 1–2 (без даты дзённай і подпісаў); AGAD, AR, dz. II, ks. 60, s. 28–30 (тое самае); BPAU-PAN, rkps. 6122, s. 208–208v (без даты і подпісаў; але ў канцы пазнака, што кароль падпісаў яго 22 ліпеня, пасля чаго адразу выехаў у Львоў); AGAD, ZBS, sygn. 41/55, k. 106v–107v (на палях памылковая дата 24 ліпеня 1698 г.); A.Ch. Załuski, *Epistolarum*…, t. II, p. 599–601 (лацінскі пераклад, без подпісаў); параўн.: K. Zawisza, *Pamiętniki*..., s. 197; [J.B.] Parthenay, *Dzieje panowania*…, s. 120; K. Jarochowski, *Dzieje panowania Augusta II od śmierci Jana III do chwili wstąpenia Karola XII na ziemię polską*, Poznań 1856, s. 178–179. Акрамя Аўгуста II, чый подпіс ідзе першым, пагадненне падпісалі: куяўскі біскуп Станіслаў Домбскі, плоцкі біскуп Анджэй Залускі, лэнчыцкі ваявода і вялікапольскі генеральны стараста Рафал Ляшчынскі, мальбаркскі ваявода Ян Ежы Пшэбяндоўскі, каронны

У той жа дзень Аўгуст II выдаў два ўніверсалы. Першым паведаміў пра заключанае пагадненне, заклікаў шляхту ВКЛ адмовіцца ад паспалітага рушэння і распусціць выправы, пагражаючы адказнасцю перад законам за самавольства[29]. Другім склікаў на 29 лістапада вайсковую камісію ў Берасці, на 25 жніўня – соймікі для абрання на яе камісараў (па адным з павета), а з сената прызначыў у яе склад віленскага біскупа Канстанцыя Казіміра Бжастоўскага, полацкага ваяводу Дамініка Слушку, берасцейскага ваяводу Стафана Курча, менскага ваяводу Міхала Сесіцкага і наваградскага кашталяна Стафана Александровіча[30]. Акрамя віленскага біскупа, усе яны былі блізкія да Сапегаў, што магло выклікаць незадаволенасць рэспубліканцаў.

---

рэферэндар Станіслаў Антоній Шчука (як пасрэднікі, прызначаныя каралём), польны гетман ВКЛ і віленскі кашталян Юзаф Багуслаў Слушка, вялікі гетман ВКЛ і віленскі ваявода Казімір Ян Сапега, вялікі падскарбі ВКЛ Бенядзікт Павел Сапега, падстолі ВКЛ Лявон Казімір Агінскі і берасцейскі падкаморы Людвік Канстанцый Пацей. Апошнія два падпісаліся як „прадстаўнікі" (рэспубліканцаў), але ў трох копіях пасля подпісу Агінскага ідзе агаворка – *„cum plena województw i powiatów ratihabitione"*, якая можа разумецца, як дзеянне звыш атрыманага даручэння, пры ўмове яго наступнага зацвярджэння: AGAD, AZ, sygn. 3055, k. 69; BCz, rkps. 192, nr 47, k. 266; LVIA, f. 1135, ap. 2, b. 27, l. 312. Таксама ў першай з іх адстунічае подпіс Залускага, а яшчэ ў іншай копіі на месцы яго стаіць пазнака: „месца, пакінутае на подпіс яго міласці ксяндза наміната варшаўскага": AGAD, AR, dz. II, ks. 35, s. 826. Відаць, тут памылка з вармінскім, а копія рабілася не раней, чым у наступным годзе, калі Залускі заняў гэтую пасаду. Таксама ў гэтай копіі пасля подпіса Агінскага ідзе: *„cum plena województw i powiatów concordia"* – відаць, памылкова.

[29] НГАБ, КМФ-18, спр. 149, арк. 243 адв. – 244, універсал Аўгуста II да Жамойцкага княства, Варшава, 22 ліпеня 1698 г.; Тамсама, ф. 1733, воп. 1, спр. 14, арк. 545–545 адв., тое самае да Пінскага павета; AGAD, AR, dz. II, sygn. 1867, s. 2–3, тое самае (без указання павета і б. д.); BCz, rkps. 1668, s. 232–233, тое самае (б. д. дзённай, адрозненні ў тэксце); параўн.: [J.B.] Parthenay, *Dzieje panowania*…, s. 121.

[30] НГАБ, КМФ-18, спр. 149, арк. 244, універсал Аўгуста II, Варшава, 22 ліпеня 1698 г.; тое самае: Тамсама, ф. 1733, воп. 1, спр. 14, арк. 546–546 адв.; VUB RS, f. 7, sign. 32/13909, l. 48; тое самае, б. д. дзённай: AGAD, ZBS, sygn. 41/55, s. 108–108v (да Віленскага павета); Ibidem, AR, dz. II, sygn. 1867, s. 1–2; BCz, rkps. 1668, s. 233–234.

Адразу пасля завяршэння перамоваў Аўгуст II выехаў на вайсковую кампанію супраць турак і татараў. У той жа дзень ён падпісаў „асекурацыю”, якой абавязаўся выдаць войску ВКЛ абяцаныя падчас элекцыі грошы на пакрыццё даўгоў па заробку, як толькі войска з’явіцца ў лагеры пад Львовам[31].

Пагадненне было заключана часткова дзякуючы таму, што ўдалося задобрыць прэтэнзіі Пацея. Бакі пагадзіліся, што той атрымае 50 тыс. злотых кампенсацыі за страты падчас канфлікта, таксама яму вярталіся паперы, забраныя падчас нападу. Гэтая кампенсацыя мусіла быць выплачана вялікім гетманам з сумы, якую Аўгуст II абяцаў выдаць войску ВКЛ[32]. Верагодна, назаўтра, 23 ліпеня, была вырашана і спрэчка за ўрад польнага пісара. Была выкарыстана наступная камбінацыя: урад атрымаў Міхал Юзаф Сапега, а вызвалены ім урад стражніка кароль перадаў Пацею[33].

---

[31] AGAD, AZ, sygn. 3055, k. 75, асекурацыя Аўгуста II, Варшава, 22 ліпеня 1698 г.

[32] Archiwum Narodowe w Krakowie, Archiwum Młynowskie Chodkiewiczów, sygn. 1027, s. 251–252, дамова К.Я. Сапегі з Л.К. Пацеем, [Варшава], 22 ліпеня 1698 г.; LVIA, f. 1292, ap. 1, b. 44, l. 34–37, тое самае, упісана ў кнігі Галоўнага Трыбунала ВКЛ 12 чэрвеня 1713 г. як асекурацыйны запіс К.Я. Сапегі, выпіс. Акрамя Сапегі і Пацея, дамову падпісалі пасрэднікі: куяўскі біскуп Домбскі, польны гетман Слушка і мальбаркскі ваявода Пшэбяндоўскі. Паколькі выплата грошай войску ВКЛ зацягвалася, яшчэ праз год падскарбі Сапега пісьмова абавязаўся, што пракантралюе на камісіі па падзелу гэтых грошай, каб уся сума была выдадзена Пацею: Ibidem, l. 52–53, асекурацыйны запіс Б.П. Сапегі, Варшава, 13 жніўня 1699 г., упісаны ў кнігі Галоўнага Трыбунала ВКЛ 12 чэрвеня 1713 г., выпіс. Паколькі грошы войску каралём выплачаны не былі, гэтая дамова стала пазней прадметам разбіральніцтва. Прычым усе прэтэнзіі Пацей выстаўляў Сапегам, а менавіта падскарбію Бенядзікту Паўлу, і пасля Алькенікаў дабіўся завочна прысуджэння сабе гэтай сумы: НГАБ, ф. 1705, воп. 1, спр. 117, арк. 630–631, скарга Л.К. Пацея ў берасцейскі гродскі суд, 7 жніўня 1700 г.; LVIA, f. 1292, ap. 1, b. 44, l. 14–15, тое самае, выпіс; Ibidem, l. 24–27, дэкрэт Галоўнага Трыбунала ВКЛ у гэтай справе, 16 лютага 1701 г.; Ibidem, SA, b. 388, l. 1879–1882v, тое самае.

[33] *Urzędnicy centralni*…, s. 110, 191; BCz, rkps. 192, nr 51, k. 305–306, Аўгуст II да К.С. Радзівіла, Гура, 23 ліпеня 1698 г. (кароль паведамляў, што польнае пісарства нададзена М.Ю. Сапегу, каб аблегчыць заключэнне пагаднення, і прасіў

Таксама ўзнікае пытанне, ці не ў рамках нейкіх папярэдніх дамоўленасцей у гэтай справе лідар рэспубліканцаў Міхал Казімір Коцел атрымаў кантракт на гадавую арэнду мыта ВКЛ, пачынаючы з 1 ліпеня гэтага года[34]. Хаця ўлічваючы яго непрымірымую пазіцыю, сцвярджаць тут нешта складана.

Аднак гэтае пагадненне, на заключэнне якога пайшло столькі часу і намаганняў першых асоб у дзяржаве, было сарванае практычна адразу. У той жа дзень, калі яно было заключана, г. зн. 22 ліпеня, пад Юрбаркам у Жамойці адбылася бітва паміж войскам Агінскага і часткай войска ВКЛ пад камандаваннем стольніка ВКЛ Станіслава Юрыя Сапегі, у ходзе якой Агінскі пацярпеў паражэнне і быў вымушаны ратавацца ўцёкамі на тэрыторыі Прусіі[35].

Пасля атрымання звестак пра варшаўскае пагадненне Коцел пратэставаў у Галоўным Трыбунале ВКЛ разам зураднікамі розных паветаў, прысутнымі на той час у Вільні, бо расцаніў яго як замах на каэквацыю і парушэнне права „вольнага голасу"[36]. Рэспубліканцы прыводзілі наступныя аргументы, што прымаць яго нельга: па-першае, што ў паслоў не было паўнамоцтваў на яго заключэнне; па-другое, што яно закранала пытанні, якія належаць да кампетэнцыі сойма (павелічэнне войска, аклады гетманаў і падскарбія, скасаванне трыбунальскіх дэкрэтаў); нарэшце, незадаволенасць іх выклікала тое, што быў праігнараваны шкудскі трактат ад 3 сакавіка, заключаны іх камісарамі з войскам Агінскага, які скасоўваў усю запазычанасць шляхты па заробку перад войскам,

---

запячатаць яму прывілей); AGAD, AR, dz. V, sygn. 13939/IV, s. 44, К. Сарнэцкі да К.С. Радзівіла, [Варшава], 24 ліпеня 1698 г. Прывілей Сапегу датаваны 25 ліпеня, Пацею – 10 ліпеня, магчыма, заднім днём.

[34] LVIA, SA, b. 387, l. 1822–1825v, дэкрэт Галоўнага Трыбунала ВКЛ, 25 жніўня 1700 г. Пазней падскарбі і віцебскі кашталян узаемна абвінавачвалі адзін аднаго ў невыкананні абавязальніцтваў: першы сцвярджаў, што Коцел цалкам не разлічыўся па гэтым кантракце, другі – што ўсё выплаціў, але не атрымаў у скарбе разліку.

[35] [J.B.] Parthenay, *Dzieje panowania*…, s. 121; K. Jarochowski, *Dzieje panowania*…, s. 178–180; A. Rachuba, *Wielkie Księstwo Litewskie*..., s. 319.

[36] AGAD, AR, dz. II, sygn. 1855, s. 1; K. Zawisza, *Pamiętniki*... s. 198.

акрамя 4 чвэрцяў[37]. У больш разгорнутым варыянце іх аргументы выглядалі наступным чынам. Вайсковая камісія была непрымальная, бо сярод рашэнняў апошняга сойма значылася толькі камісія для падзелу грошай, абяцаных Аўгустам II (выплата 4 чвэрцяў, абяцаных паводле шкудскага трактата, магла быць разгледжана на гэтай жа камісіі). Турбаваў іх таксама склад камісараў (пагаджаліся толькі на прызначаных каранацыйным соймам). Гетман не павінен быў займацца размяшчэннем на кватэры, бо пастанова аб каэквацыі перадавала гэта асобнай камісіі. Парадак выплаты таксама аспрэчваўся: не грошы неабходна было звозіць на кватэры, а самі харугвы дасылаць прадстаўнікоў у паветы з асігнацыямі ад гетмана. Аклады гетманаў мусілі заставацца ранейшыя: 60 тыс. злотых вялікаму і 40 тыс. – польнаму гетману. Таксама яны не пагаджаліся на перадачу збору некаторых падаткаў скарбу, бо гэта парушала б каэквацыю. Татары мусілі несці службу, не ўваходзячы ў рэестр. Нанятыя звыш дазволенай колькасці рэйтарскія харугвы мусілі быць распушчаныя. Нарэшце, рэспубліканцы не пагаджаліся, што ўсе крыўды і прэтэнзіі павінны быць дараваныя. І галоўны іх аргумент – паслы не мелі паўнамоцтваў заключаць пагадненне. Таксама да Вільні дайшлі навіны пра падзеі ў Жамойці, дзе Агінскі пацярпеў паражэнне. Таму рэспубліканцы ў Вільні пісалі, што ўжо не да пагаднення, і заклікалі да „абароны і ратавання свабоды”[38].

У выніку Коцел вырашыў склікаць у Вільні новы агульнакняскі з’езд. Гэты з’езд, які прайшоў у сярэдзіне жніўня, прыняў рашэнне

---

[37] LMAVB RS, f. 17, b. 53, l. 16–16v, „Тлумачэнне, што ніякая мірная дамова ВКЛ, пра якую пагалоска разносіць, нібыта яна была заключаная ў Варшаве 12 ліпеня ў гэтым годзе без ведама ваяводстваў і паветаў ВКЛ, не можа мець месца і, [як вынікае] з ніжэй пададзеных пунктаў, прынятая быць не можа”; A.Ch. Załuski, *Epistolarum…*, t. II, p. 609–610, тое самае ў лацінскім перакладзе.

[38] LMAVB RS, f. 17, b. 53, l. 16v – 18v, „Адказ на кожны пункт шкоднага пагаднення, нібыта заключанага ў Варшаве без ведама ваяводстваў і паветаў”; A.Ch. Załuski, *Epistolarum…*, t. II, p. 610–612, тое самае ў лацінскім перакладзе; параўн.: K. Zawisza, *Pamiętniki*... s. 198. Хутчэй за ўсё, гэтыя пярэчанні зыходзілі ад самога Коцела.

склікаць паспалітае рушэнне, каб з дапамогай яго прымусіць войска ВКЛ да роспуску. Дадзеная спроба, дастаткова добра вядомая ў гісторыі, скончылася для рэспубліканцаў частковым поспехам – роспускам паловы войска ВКЛ, якое было галоўнай апорай Сапегаў.

Ацэньваючы перамовы ў цэлым, можна адзначыць, што іх лёс у значнай ступені залежаў ад непадатлівасці лідараў рэспубліканцаў, якія не жадалі ні самі ў іх удзельнічаць, ні прызнаваць адпаведныя паўнамоцтвы паслам, хаця і не адмаўлялі іх цалкам. З другога боку, можна заўважыць, што і Сапегі, і кароль фарсіравалі гэтыя перамовы, прасоўваючы заведама непрымальныя ўмовы, асабліва што тычыцца войска. Інтарэс караля ў павелічэнні колькасці войска перад кампаніяй цалкам зразумелы. Відавочна, непакоіла рэспубліканцаў і збліжэнне на гэтай глебе караля з Сапегамі. Гэтыя разыходжанні прадвырашылі лёс пагаднення, якое не было прынятае лідарамі рэспубліканцаў у ВКЛ і прывяло нават, разам з паражэннем іх войска пад Юрбаркам, да яшчэ большага абвастрэння.

## Бібліяграфія

### Архіўныя крыніцы

Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD), Archiwum Radziwiłłow (AR), dz. II, ks. 27.

AGAD, AR, dz. II, ks. 32.

AGAD, AR, dz. II, ks. 35.

AGAD, AR, dz. II, ks. 60.

AGAD, AR, dz. II, sygn. 1855.

AGAD, AR, dz. II, sygn. 1867.

AGAD, AR, dz. V, sygn. 11913/I.

AGAD, AR, dz. V, sygn. 13939/IV.

AGAD, AR, dz. V, sygn. 15655.

AGAD, Archiwum Publiczne Potockich, sygn. 134.

AGAD, Archiwum Tyzenhauzów, C-12.

AGAD, Archiwum Zamojskich, sygn. 3055.

AGAD, Zbiór Branickich z Suchej (ZBS), sygn. 41/55.

AGAD, ZBS, sygn. 46/60.

Archiwum Narodowe w Krakowie, Archiwum Młynowskie Chodkiewiczów, sygn. 1027.
Archiwum Państwowe w Toruniu, kat. II, dz. XIII, sygn. 34.
Biblioteka Książąt Czartoryskich w Krakowie (BCz), rkps. 192.
BCz, rkps. 521.
BCz, rkps. 1668.
BCz, rkps. 3436.
Biblioteka PAU i PAN w Krakowie (BPAU-PAN), rkps. 977.
BPAU-PAN, rkps. 6122.
Biblioteka Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu, rkps. 260/II.
Lietuvos mokslų akademijos Vrublievskių biblioteka. Rankraščių skyrius (LMAVB RS), f. 17, b. 53.
LMAVB RS, f. 148, b. 62.
Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA), f. 1135, ap. 2, b. 27.
LVIA, f. 1135, ap. 2, b. 65.
LVIA, f. 1292, ap. 1, b. 44.
LVIA, Senieji aktai (SA), b. 43.
LVIA, SA, b. 214.
LVIA, SA, b. 385.
LVIA, SA, b. 387.
LVIA, SA, b. 388.
Vilniaus universiteto biblioteka. Rankraščių skyrius (VUB RS), f. 7, sign. 32/13909.
L′vìvs′ka nacìonal′na naukova bìblìoteka Ukraïni ìm. V. Stefanika. Vìddìl rukopisìv, f. 5, op. 1, spr. 1447 [Львівська національна наукова бібліотека України ім. В. Стефаника. Відділ рукописів, ф. 5, оп. 1, спр. 1447].
Nacyjanaĺny histaryčny archiŭ Bielarusi (NHAB), KMF-18, vop. 1, spr. 149 [Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), КМФ-18, воп. 1, спр. 149].
NHAB, f. 694, vop. 12, spr. 261 [НГАБ, ф. 694, воп. 12, спр. 261].
NHAB, f. 1705, vop. 1, spr. 117 [НГАБ, ф. 1705, воп. 1, спр. 117].
NHAB, f. 1733, vop. 1, spr. 14 [НГАБ, ф. 1733, воп. 1, спр. 14].

## Апублікаваныя крыніцы і літаратура

*Awizy warszawskie różne y lwowskie*, z Krakowa, 5 Iulij 1698.
Jarochowski K., *Dzieje panowania Augusta II od śmierci Jana III do chwili wstąpenia Karola XII na ziemię polską*, Poznań 1856.

Parthenay [J.B.], *Dzieje panowania Fryderyka Augusta II, króla polskiego*, Warszawa 1854.

Rachuba A., *Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763*, Warszawa 2002.

Sliesoriūnas G., *Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės Vyriausiasis Tribunolas Vilniuje XVII ir XVIII amžių sandūroje – politinės kovos arena*, „XVIII amžiaus studijos", t. 2, Vilnius 2015, p. 250–275.

*Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku*, oprac. H. Lulewicz i A. Rachuba, Kórnik 1994.

*Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego (UWKL)*, t. II: *Województwo trockie. XIV–XVIII wiek*, pod red. A. Rachuby; oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, P.P. Romaniuk, A. Haratym; przy współpracy A. Macuka i J. Aniszczanki, Warszawa 2009.

*UWKL*, t. IX: *Województwo mścisławskie, XVI–XVIII wiek*, pod red. A. Rachuby; oprac. H. Lulewicz, T. Jaszczołt, A. Radaman, A. Rachuba, P.P. Romaniuk, A. Macuk, A. Danilczyk, A. Haratym, Warszawa 2019.

Vićko D., Haloŭny Trybunal VKL 1698 h.: sudovaja rasprava nad Sapiehami, „Arche", 2016, № 3, s. 84–139 [Віцько Д., *Галоўны Трыбунал ВКЛ 1698 г.: судовая расправа над Сапегамі*, „Arche", 2016, № 3, с. 84–139].

Vićko D., Padstoli VKL Liavon Kazimir Ahinski i jaho rolia ŭ mižusobnych kanfliktach kanca XVII st., „Hieroĺd Litherland", № 22, Horadnia–Miensk 2021, s. 33–39 [Віцько Д., *Падстолі ВКЛ Лявон Казімір Агінскі і яго роля ў міжусобных канфліктах канца XVII ст.*, „Герольд Litherland", № 22, Горадня–Менск 2021, с. 33–39].

Vićko D., Respublikanska-sapiežynskija pieramovy na z'jezdzie ŭ Horadni vosienniu 1701 h., „Bielaruski histaryčny ahliad", t. 18, sš. 1–2, 2011, s. 61–97 [Віцько Д., *Рэспубліканска-сапежынскія перамовы на з'ездзе ў Горадні восенню 1701 г.*, „Беларускі гістарычны агляд", т. 18, сш. 1–2, 2011, с. 61–97].

Załuski A.Ch., *Epistolarum historico-familiarium*, t. II, Brunsbergae 1711.

Zawisza K., *Pamiętniki (1666–1721)*, wyd. J. Bartoszewicz, Warszawa 1862.

**Negotiations between the Sapiehas and Republican deputies in Warsaw in the summer of 1698**

An article devoted to a hitherto little-known attempt to peacefully end a great conflict, which went down in history as the civil war in the Grand Duchy of Lithuania (1696–1702). The causes of the conflict have not yet been fully explored. According

to the author, they were best revealed during negotiations between the warring parties. The materials of the discussed negotiations provide the opportunity to trace mutual grievances, and based on how the conditions changed, we can deduce to what extent the parties actually sought to conclude a lasting settlement. The discrepancies concerned primarily the size and payment of the army, fiscal abuses and some other issues. Negotiations lasted from June 30 to July 22, 1698, under the auspices of King August II and some senators of the Commonwealth, and resulted in a settlement between the Sapiehas and the Republican deputies, who acted without the necessary powers, hoping for a future confirmation of the agreement. Under these conditions, the agreement did not resolve all the contentious issues, and partly even deepened them by increasing the number of troops and the remuneration of hetmans. The leading republicans remaining in the Grand Duchy rejected it and began preparations for a mobilization of nobility. In this way, instead of appeasing the conflict, it exacerbated it.

Keywords: negotiations, party, republicans, army